**Міхайлаў, А.** А ты б змог? / А. Міхайлаў // Шлях перамогі (Глыбокае). — 1989. — 20 чэрв. — С. 2.

# А ТЫ Б ЗМОГ?

*Па вясне ён выводзіў трактар на палеткі саўгаса «Івесь». Як добрага знаёмага бяздоннае чысцюткае неба вітала яго меладычным звонам жаўрука. І, удыхнуўшы на ўсе грудзі гаючага паветра радзімы, Аляксандр сядаў у кабіну, звычна націскаў на пядаль.*

*А вясна раскашавала, ягоная апошняя вясна: кулямётчык, малодшы сяржант Аляксандр Чаронка загіне смерцю храбрых, выконваючы інтэрнацыянальны абавязак, і будзе пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.*

«Трэці раз сабраліся ў Глыбокім спартсмены з Літвы, Латвіі, Грузіі, з Мінска, Барысава, Віцебска, Наваполацка, Обалі, Беразіно, Сянно на турнір па класічнай барацьбе, прысвечаны памяці Аляксандра Чаронкі. І ўрачыстая цырымонія адкрыцця турніру ўсхвалявала да глыбіні душы: сэрцам, розумам мы яшчэ раз спрабавалі спасцігнуць вытокі подзвігу сціплага глыбоцкага юнака, які ў гарах Афганістана да апошняга дыхання вёў бой з душманамі.

220 юных барцоў слухалі пранікліваe выступленне сакратара райкома камсамола Аліны Будзько, і, несумненна, кожны з іх пакутваў над пытаннем:

– А я б так змог?

І потым, на барцоўскім дыване, калі ўжо не ставала ні сіл, ні змогі, калі той, другі, упэўнены ў перамозе, набіраў ачкі, зноў, можа, у падсвядомасці паўставала гэтае пытанне. І тады аднекуль браліся сілы, і адолены табой сапернік недаўменна пазіраў на цябе…»

Так пачынаўся мой матэрыял «Поле барцоўскага дывана», змешчаны ў раённай газеце ў лютым мінулага года. І дзіўна тое, што, пабываўшы на малой радзіме Аляксандра, сустрэўшыся і пагутарыўшы з ягонай маці Вольгай Лявонцьеўнай, настаўнікамі Завулкаўскай няпоўнай сярэдняй школы, па-іншаму не мог я пачаць і гэты, сённяшні матэрыял пра сціплага юнака з глыбіннай глыбоцкай вёскі. Бо не слёзы маці, бацькі, брата і сястры хачу выклікаць ім (слёз і болю і так стае), а проста расказаць пра тое, якім чалавекам быў Саша, сцвердзіць думку, што памяць пра яго непадуладная гадам. Пра гэта сведчыць і турнір па класічнай барацьбе, прысвечаны яму, і піянерскі атрад імя А. Чаронкі ў Завулкаўскай школцы, і літаратурны твор – верш Івана Волкава «Аляксандр Чаронка».

Сашу я бачыў толькі на здымку: з родзічамі ў абдымку стаяў ён каля ваенкамата пад прыцэлам фотааб’ектыву. Упарты позірк. Адкрыты валявы твар. Гэта апошні яго «цывільны» здымак, які маці Вольга Лявонцьеўна дбайна захоўвае ў невялічкай шкатулцы. Тут жа пісьмы. Ужо адтуль, Афганістана.

Самае звычайнае, на першы погляд. Падобнае сам не раз пісаў сваёй маці:

– Ці дапамог хто нарыхтаваць дровы, ці хопіць сена?

А вось абстаноўка, у якой пісаўся гэты ліст, была зусім незвычайная: паўдзённая спёка, горы, аўтаматныя, кулямётныя чэргі. І кожную хвілінку чакай каманды:

– На батээры!..

Спрабую ўявіць сябе на месцы Аляксандра і не магу. І не таму, што палоняць боязь і страх. Проста маё мірнае самапачуванне як належнае ўспрымае чысціню нябёс над галавой, зелень

травы, пеpазовы птушак. І нават у думках перанесціся туды, дзе штохвілінна цябе падпільноўвае смерць, – немагчыма.

І ўсё ж у гутарцы з настаўнікамі Завулкаўскай НСШ Зінаідай Міхайлаўнай Пылінскай, Аленай Аўдзееўнай Філіпчык абараняў думку: маўляў, кожны, каго б ні накіравалі ў Афганістан, з гонарам выканаў бы свій інтэрнацыянальны абавязак.

Настаўнікі, якія вучылі Аляксандра, запярэчылі:

– Не, не кожны. Ёсць такія, якія на хаду лапці могуць падплесці. Яны б часовымі, ненадзейнымі былі б там, у Афганістане.

– А Аляксандр?

– А ён быў надзейным.

Міжволі згадаліся радкі паэта: «Те, кто погибли, те храбрее». І згадкай гэтай зусім не хачу прынізіць Анатоля Костыля, Браніслава Храла, Аляксандра Прэдкеля, Мікалая Шынельку, Паўла Патапенку – івесьскіх хлопцаў, якія таксама прайшлі выпрабаванне Афганістанам. А ўсё ж думку паэта хочацца прыняць.

Саша рос паслухмяным, ціхмяным хлопчыкам. Паслухмяным у тым сэнсе, што ведаў, як нялёгка даводзіцца адной маці (з бацькам жыццё не склалася) ставіць на ногі траіх. Памагаў, смак і горыч працы зведаў змалку. Вельмі любіў гуляць у вайну. Майстраваў пісталеты, аўтаматы, кулямёты, ручныя гранаты. Нават у сне ваяваў.

Любіў блукаць па лесе. Аднойчы прыйшоў да маці і ціхенька папрасіў:

– Мама, давай купім сабачку. Я, як вырасту, леснікам буду. Лес буду берагчы.

Яшчэ Вольга Лявонтьеўна расказвала пра мэтаімкнённасць Сашы:

– Калі слова даваў, то рабіў усё, каб стрымаць яго. Нават у тых самых ваенных гульнях не выдаваў, не падводзіў сяброў. Няхітры быў. З даверлівымі вачыма і адкрытай душой ішоў у жыццё.

Рос, развіваўся, вучыўся Саша як усе. Нічым не вызначаўся. Але я заўважыў, што настаўнікі гаварылі пра яго з асаблівай цеплынёй і пашанай. І не таму, што пра тых, каго ўжо з намі няма, звыклі мы прамаўляць толькі добрыя словы.

– Ведаеце, ён чэсны быў, сэрцам чысты. І часам такім безабаронным, што хацелася падысці да яго і пагладзіць па галоўцы. Толькі залішняй ласкі і ўвагі да сябе не любіў. А як жа – хлапчук, будучы воін.

Калі слухаю «Афганскі вецер» у выкананні Валерыя Лявонцьева, самапачуванне – не вытлумачыць. Тут і адчай, і боль страт, і пякучае адчуванне нібыта і сваёй віны…

Пазней прыходзіць разуменне: не, не спадкаемцамі жывём на зямлі. Не мы, дык нашы маладзейшыя браты, сябры, аднавяскоўцы на справе, на словах даказалі вернасць сваім дзядам, бацькам, якія ўратавалі планету ад фашызму. І не трэба агулам чарніць сённяшнюю моладзь. Такія яе байцы, як Аляксандр Чаронка, не даюць нам на гэта права.

**А. Міхайлаў**